Падтрымай "Вясну" на PATREON

Суд над палітзняволенымі анархістамі зрабілі закрытым. Што вядома па справе?

29.03.2022 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед, грамадства, палітвязні, пераслед, ціск, рэпрэсіі



29 сакавіка ў Мінскім абласным судзе ў 11 гадзін пачаўся разгляд крымінальнай справы ў дачыненні да палітзняволеных анархістаў Аляксандра Бялова, Яўгена Рубашкі, Арцёма Салаўя і Арцёма Салаўя.

Справу разглядае суддзя **Алена Міснік**.

Праз 20 хвілін пасля пачатку працэса пасяджэнне зрабілі закрытым па хадайніцтву пракурора **Аляксандра Рамановіча,** вядомага па іншых палітычных працэсах: ён падтрымліваў бок дзяржабвінавачання ў паседжаннях над палітзняволеным студэнтам Уладзіславам Марціновічам, палітзняволеным інжынерам-праграмістам Раманам Канановічам, палітзняволеным антыфашыстам Уладзіславам Зяневічам і іншых.

Ён адзначыў, што дадзеная крымінальная справа выдзеленая з іншай крымінальнай справы, папярэдняе расследаванне па якой вядзецца і дагэтуль — у тым ліку, датычна да іншых меркаваных саўдзельнікаў абвінавачаных. Акрамя таго, матэрыялы справы змяшчаюць інфармацыю, прызнаную экстрэмісцкай. Праз гэта пракурор хадайнічаў аб разглядзе справы ў закрытым рэжыме. Таксама ён адзначыў, што гэта патрэбна дзеля забеспячэння аховы таямніцы следства, якая ахоўваецца законам, а таксама з мэтай выключэння распаўсюджвання інфармацыйнай прадукцыі, прызнанай экстрэмісцкай. **Усе абвінавачаныя і іх абаронцы выступілі супраць**.

Нягледзячы на гэта, Алена Міснік задаволіла хадайніцтва Рамановіча. Далей справа будзе разглядацца ў закрытым рэжыме. Яна дадала, што акрамя заяўленых дзяржабвінаваўцам прычын, у матэрыялах справы ўтрымліваюцца дадзеныя пра асобаў, якія не падлягаюць разгалошванню ў судовым пасяджэнні.




Пракурор Аляксандр Рамановіч і суддзя Алена Міснік, якія зрабілі паседжанне закрытым

Вядома, што на паседжанні таксама прысутнічае прадстаўніца грамадзянскага пазоўніка — КУП "Мінсктранс" — **Вольга Емельяненка**. Верагодна, яна была ў складзе ўчастковай камісіі па выбарам прэзідэнта ўчастка для галасавання №88 падчас выбараў у 2020 годзе. Яна прадстаўляла Мінскую гарадскую арганізацыю Беларускай сацыяльна-спартыўнай партыі. Згодна з дадзенымі платформы "Голас", вынікі на гэтым участку былі сфальсіфікаваныя.

Нагадаем, анархістаў абвінавачваюць па `арт. 342` Крымінальнага кодэкса і `ч.3 арт. 361-1` Крымінальнага кодэкса.

Арцём Дзмітрыевіч Салавей быў затрыманы 4 жніўня 2021 года і збіты супрацоўнікамі міліцыі: яго ставілі ў "ластаўку" і пагражалі згвалтаваннем, каб ён сказаў пароль ад свайго тэлефона. 5 жніўня быў асуджаны судом Заводскага раёну на 15 сутак за дробнае хуліганства па арт. 19.1 КаАП (нібыта пры

дастаўлення ў РУУС стаў паводзіць сябе агрэсіўна). Пасля адбыцця арышту быў перезатрыманы ў якасці падазраванага па крымінальнай справе. **Арцёма Сяргеевіча Салаўя** затрымалі таксама 4 жніўня 2021 года, аднак адразу ў межах крымінальнай справы.

Яўген Рубашка і Аляксандр Бялоў — актывісты анархічнага руху, былі затрыманыя 29 ліпеня 2021 года ў Мінску. У іх кватэрах прайшлі ператрусы, вядома, што пры затрыманні яны былі збітыя. Патрабуючы доступу да тэлефону і камп'ютару, Яўгену Рубашку нацягвалі на галаву пакет. Падчас пераводу ў СІЗА ў Яўгена забралі ўсе кнігі і паставілі на прафілактычны ўлік як схільнага да экстрэмізму, што азначае ўнясенне адзнакі ў асабістую справу, асаблівае стаўленне і дадатковую працу з псіхолагам.



«Сэрца смелае, якое большым стала». Гісторыя палітвязня Яўгена Рубашкі

Ён ночыў у намётах у літоўскім полі і ў рыжскіх парках, бачыў горную рэчку ў Славакіі і 100-кіламетровае возера – у Венгрыі, рабіў прывалы *ўздоўж мора ў Харватыі, шпацыраваў па Іерусаліму, Барселоне, Парыжу, Ціране, Дрэздэну, Лісабону і яшчэ дзясяткам гарадоў.*

Напярэдадні суда Жэня Рубашка напісаў адкрыты ліст таварышам:

«Мае дарагія ўсе, вітаю, з турмы ды ў вайну…

Навакольны свет стаў больш шалёным. Яму мала было тых, што сядзяць у турмах, якія жывуць пад акупацыяй дыктатур, уцекачоў ад рэпрэсій — апетыт вырас да паміраючых і тых, што бягуць ад вайны. А межы паміж дзяржавамі і нацыямі наровяць здавацца важней межаў паміж свабодай і рабствам, жыццём і смерцю.

З'яўленне ў маёй камеры зомбі-тэлека супала з першым днём вайны ва Украіне. У маім распараджэнні прапаганда з РТР, НТВ і АНТ. Адчуванне, быццам паўсталы савок не заўважыў глабальнага інфармацыйнага грамадства і шызафрэнічна працягвае верыць уласнай хлусні і міфам. А краіна-гопнік не разлічвала на адпор. І як заўсёды аўтарытарным рэжымам мала справы да пакут маленькага чалавека. **Нам жа застаецца адказваць ростам салідарнасці, гарызантальных сувязяў і супрацівам**.

Чым радыкальней погляды ў дачыненні да розных уладных структур, тым больш узнікае этычных дылем, калі пытанні ставяцца рубам самім жыццём. Спрэчкі антыаўтарытарыяў 8-гадовай даўніны зноў актуальныя. У гэтай сітуацыі маё маральнае права дазваляе мне толькі заклікаць таварышаў быць вельмі сумленнымі перад сабой ва ўласных унутраных матывах. **І ў барацьбе са злом не станавіцца тым самым злом**. Пазней мы ўсе абмяркуем да дробязяў, калі вызвалімся і застанемся жывыя... Да майго выбару паставіліся з разуменнем — мне плаціць той жа манетай. **Толькі заставайцеся жывыя ва ўсіх сэнсах, чуеце, паспрабуйце не разбіць да чарцей маё сэрца, якое любіць вас!**

Кожны раз пасля жніўня 2020, калі мяне пранізвае агідай ад прыхільнікаў прыгнёту, я паўтараю сабе гэтыя радкі (гурта "Король червей"):

> "А мы будем теплом сердец своих греться
> Жаться друг к другу крепче
> На ваших могилах будем танцевать
> Танец ненависти и любви".

Ваш сябар і таварыш Жэня Рубашка заўсёды побач з вамі, памятайце пра гэта, дзе б вы ні былі. У імя свабоды і жыцця, калі ласка, беражыце сябе, дарагія!

18.03.2022 г.»

Лісты салідарнасці, грашовыя пераводы і пасылкі можна адправіць па адрасе:

СІЗА-1. 220030, г. Мінск, вул. Валадарскага, 2

Яўген Аляксандравіч Рубашка
Аляксандр Андрэевіч Бялоў
Арцём Сяргеевіч Салавей
Арцём Дзмітрыевіч Салавей

Твитнуть



СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ

Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



Палітзняволеную Вікторыю Кульшу ў зарэчанскай калоніі збіваў і душыў наглядчык

"У мяне ў першы ж дзень на ЦІПе здарыўся прыступ асфіксіі", — былая арыштантка Акрэсціна

"Мы прыдумлялі розныя махінацыі, каб папросту выжыць", — экс-зняволены пра жыццё і працу ў шклоўскай калоніі

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў



ГАЛОЎНАЕ

21 траўня — Дзень палітвязняў у Беларусі. Далучайся да акцый салідарнасці!



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Патрабуем правясці расследаванне па факце смерці Мікалая Клімовіча і адсутнасці належнай медычнай дапамогі ў калоніях

Сродкі здзяйснення злачынства – штаны і майка. Мужчыну асудзілі па “народным” артыкуле

Заснавальніка Symbal.by Паўла Белавуса асудзілі да 13 гадоў калоніі

З'явіўся "даведнік рэпрэсій" на англійскай мове. Ён дапаможа міжнароднай супольнасці лепей разумець становішча ў Беларусі

Мастака Генадзя Драздова асудзілі да трох гадоў калоніі

Падазраюць у здрадзе дзяржаве і здзяйсненні акту тэрарызму: хроніка пераследу 10-11 траўня (дапоўнена)

Адвакатку Анастасію Лазарэнку асудзілі да 6 гадоў калоніі

Гімн Украіны ў караоке, БЧБ-чахол, пікетаванне ў тралейбусе: за што беларусаў судзілі ў красавіку

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Красавік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

СЯБРОЎСТВА

EENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

VOICE OF BELARUS

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY